ЯКУБ КОЛАС



Каля заставы


Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

ЯКУБ КОЛАС

КАЛЯ ЗАСТАВЫ

Вокладка і рысункі М. Карпенкі

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА
МІНСК—1939



Прысвячаю піонерам

I

Макарку Наваку мінула ўсяго толькі дванаццаць гадоў, але шмат змен адбылося за гэты час. Макарка яшчэ помніць, як бацька яго мерна ступаў за плугам на сваім вузенькім шнуры, а маці адна хадзіла жаць на гэты шнур. За ёю ішоў і Макарка: не было з кім астацца яму дома. Шмат клопату было тады матцы з Макаркам: яна спяшаецца на поле, а Макарка падыйдзе і спыніцца. То ён зглеедзіць на дарозе цікавага жучка, то з травы ўзнімецца птушка, то праляціць

прыгожы матылёк. Макарку хацелася на ўсё паглядзець і ўсё разглядзець, пра ўсё распытаць, каб адвесці кожнай з'яве яе належнае месца. Цяпер усё гэта здаецца яму далёкім і нават смешным, а тады справа прымала часамі нечаканы абарот. Матка злавалася, крычала на Макарку, і Макарка справядліва адчуваў сябе пакрыўджаным няўвагаю маткі да таго, што так моцна цікавіла і займала яго дзіцячыя мыслі.

Так было яшчэ гадоў восем таму назад. Цяпер калі зірнуць на іхняе поле, дык яго і не пазнаць: папрападалі межы, а з імі і вузкія шнуры разам з адзінокімі постацямі аратых і жней. Макарка часта любаваўся полем у яго новым выглядзе: такое-ж яно прасторнае! А па полі паважна поўзаюць трактары, адразаючы зараз цэлы гурт скібаў пахучай зямлі, напаўняючы цішыню ўзлескаў магутным гоманам. А на трактарах сядзяць свае-ж хлопцы і спрытна водзяць паслушныя ім машыны. Макарка не раз пазіраў на трак-

тарыстаў, на іх зухаўскую пасадку, на ссунутыя на патыліцу шапкі, на іх крэпкія, загарэлыя рукі і зайздросціў ім ад усяго сэрца і ў той-жа час ён шчыра ганарыўся імі. І што асабліва здзіўляла тут Макарку, дык гэта тое, што на адным трактары сядзела Марына Кунашка. Яе чырвоная хустачка, завязаная паўзверх русавых кудзер, здалёку кідалася ў вочы і нейкім асаблівым чынам вылучала яе постаць на гэтай шырокай зямлі. Яна напэўна спявала песню, бо ў яе быў добры голас, і яна любіла спяваць. Пазіраючы на гэтых жалезных коней і на трактарыстаў, Макарка цвёрда пастанавіў—навучыцца кіраваць трактарам, калі ён вырасце.

Змянілася не толькі поле—змены адбыліся і ў іх вёсцы. Павырасталі новыя будынкі: клуб, школа, больніца, дзіцячыя яслі і сад, а каля гэтых будынкаў раскінуліся прыгожыя дворыкі і пляцоўкі з чысценькімі роўнымі дарожкамі, клумбамі, дзе раслі самыя рознастайныя

кветкі. Тут можна было і пагуляць і пасядзець на лаўках-канапках пад ценем маладых каштаноў. І ўсё гэта прыемна кідалася ў вочы і вабіла да сябе, выклікала пачуцце замілавання да гэтай новай зямлі, да людзей, што абнаўлялі яе і будавалі на ёй новы чалавечы ўтулак. А што асабліва падабалася Макарку, дык гэта шасейная дарога, збудаваная таксама за Макаркаву памяць. Яна спараджала ў яго сэрцы нейкае новае пачуццё, пачуццё далечыні і прасторы. Як слаўна было прайсціся па гэтай дарозе! Колькі паваротак рабіла яна, пралёгшы між узгоркаў і сядзіб, перасекшы лясы і балоты! Часамі на цэлыя кілометры расцілалася яна роўным, нібы выбеленым на сонцы ільняным палатном. Як чаруюць і вабяць да сябе акуратненька і клапатліва пастаўленыя праз пэўную адлегласць лаўкі каля дарогі! Утульна стаяць яны на маленькіх расчышчаных пляцоўках у цяні дрэўцаў. Вось так, здаецца, і гавораць падарожніку: «Прысядзь, калі ласка!

Адпачні ды паразважай, браток!» А колькі прыгожых кветнічкоў каля дарогі ды колькі на іх усялякіх кветак! А гэтыя белыя слупкі з прыбітымі на іх дошчачкамі, на якіх паказаны розныя дарожныя знакі і надпісы—назвы дарог, сядзіб, вёсак, гарадоў! А як прыгожа выведзены на адкосах дарогі дзяржаўныя гербы, розныя лозунгі, кожная літара якіх зложана з маленькіх каменьчыкаў, кусочкаў цэглы, пафарбаваных у розныя колеры. А колькі руху на гэтай дарозе! Колькі машын прабягае па ёй! Макарка любіў пазіраць, як імчацца машыны і часамі, так сабе, жартам, падымаў руку, каб падвезлі яго на машыне... Дык як-жа не любіць такую слаўную дарогу!

Многа думак спараджае яна ў Макаркавай галаве. І хочацца яму прайсці яе з канца ў канец. Праўда, адзін яе канец Макарку амаль увесь вядомы: гэты канец упіраецца ў прыгранічча, а Макарка жыве непадалёку ад граніцы. Калі ўзыйсці унь на той узгорак, што лявей вёскі, дык ад-

туль відаць другая краіна, над якою распасцірае крыллі белы панскі арол.

Калі Макарку здаралася вольным часам праходзіць непадалёку ад той горкі, адкуль відаць другая зямля, то ён не мінаў гэтай горкі амаль ніколі. Узыйдзе на самую верхавіну і запыніцца: два розныя светы ляжаць перад яго вачыма. Адзін свет так вабіць і так радуе яго сваімі шырокімі прасторамі, дзе ўсе дарогі гасцінна расчынены перад ім, і ўсе яны даступны яму. Зусім іншы настрой і іншыя думкі выклікае зямля па той бок граніцы. Ён шмат чаго чуў аб тым, што робіцца там, на той зямлі. Яна часта прыцягвала да сябе яго вочы і думкі. Ён ведаў, што тая зямля—гэта зямля беларускага народа. Толькі-ж распараджаецца ёю не народ, а паны. Многа там панскіх двароў, шляхецкіх фальваркаў, пазабіраўшых самыя ўраджайныя кавалкі. Макарка ведае, што паны стварылі так званыя «ўсходнія крэсы» і засялілі іх польскімі кулакамі-асаднікамі, а народ, які жыў тут спрад-

веку, сагналі з яго зямель. І шмат беднага сялянскага люду пайшло батрачыць у панскія двары і фальваркі, або бадзяецца па гарадах, шукаючы сабе работы і не знаходзячы яе. А над ім, галодным і голым, апякуюцца паны і ксяндзы. Ні пана, ні ксяндза Макарка не бачыў, але ўяўленне аб іх зложылася ў яго думках. Ксёндз гэта вялізны чорны крумкач, віхлявы і вушасты. Ён хоча ўсё падслухаць сваімі вушамі. Яны падымаюцца і тапырацца, а вочы бегаюць, як у злодзея. Дзесяткі тысяч беднай дзятвы астаюцца там непісьменнымі, бо няма ім дзе вучыцца і няма ў што адзецца і абуцца, каб наведваць хоць тыя шляхецкія школкі, што пабудавалі паны і ксяндзы. Такая несправядлівасць моцна абурае Макарку. У іх піонерскім звяне не раз вяліся гутаркі аб тым, як лютуе там панская ўлада, як цяжка жыць беднаму працоўнаму народу пад панскім гнётам. Макарка ведае, як і ўсе піонеры, што не век будуць панаваць там паны, бо народ зно-

сіць крыўды і сваё бясправўе да пары, да часу. Употайку ён збірае сілу, каб абрушыць яе на сваіх заклятых ворагаўпрыблудаў. У сэрцы народа жывуць светлыя вобразы вялікіх прыяцеляў прыгнечанага люду, яго правадыроў і настаўнікаў, Леніна і Сталіна. Не, панскае панаванне кончыцца! Ачысціцца зямля ад трутняў-дармаедаў. Макарка ў гэтым не сумняваецца. Аб гэтым сведчыць і яго верш, дзе ёсць такая страфа:

Пан лютуе, здзекі чыніць,
Ды ён мыліцца:
Стукнуць пана малатком
Па патыліцы.

II

Жыццё ў прыгранiччы мае свае асаблівасці. Яно накладае свой адбітак і на людзей, што жывуць у прыгранiччы, вучыць іх дзяржаць вуха востра і зорка глядзець навокал. Кожнаму прыгранічнаму чалавеку вядома, з якою нянавісцю паглядае сюды пан і яго слугі, і на што

могуць пайсці яны, каб толькі нашкодзіць і прычыніць нам ліха. Макарка ведае, што для паноў суседства з намі—тое самае, што для савы, пугача і іншых начніц сонца яснага дня: яно слепіць ім вочы. Вось чаму кожны раз, калі Макарка стаяў на той горцы і думаў пра паноў, твар яго рабіўся суровым і бязлітасным, і ён падымаў руку і трос на паноў кулаком.

Залатая восень тысячамі дарог ступала, хоць яшчэ і нясмела, на зямлю і афарбоўвала яе далі і прасторы неба ў лагодныя тоны нейкага ціхага раздум'я. Тонкая, сіняватая смуга, поўная цеплыні і ласкі, песціла далёкія лясы і купчастыя бярозы, што адзінокімі постацямі абступалі старую і цяпер ужо заглухшую дарогу, бегучы разам з ёю кудысь далёка на захад і на ўсход. Праз невялікія адлегласці мяняліся далі, то звужваліся, сціснутыя лясамі і ўзгоркамі, то ізноў расступаліся, адкрываючы цэлы рад новых малюнкаў. Апошнія бабкі жыта і аўса ўжо звезены з калгасных прасторных палёў. Зноў загулі трактары, падгатаў-

ляючы зямлю да прыёму новага насення, а месцамі ўжо вялася і самая сяўба.

Макарка Навак і яго прыяцель Лёнік Атрушкевіч, абодва ў чырвоных гальштуках, варочаліся з школы дамоў. Сёння першы дзень школьных заняткаў. Уражанні першага школьнага дня, здавалася, засланілі ўсе іншыя інтарэсы і пядымалі ў хлопцаў настрой. Ужо адно ўсведамленне таго, што яны—вучні пятага класа, многа значыць. Яны адчувалі сябе амаль дарослымі людзьмі, бо ўжо з пятага класа пачынаецца сур'ёзная навука. Хлопцы ішлі вясёлыя, і настрой у іх быў узняты. Яны прайшлі палавіну дарогі. Уся-ж дарога да школы не мела і трох кілометраў. Спускаючыся з горкі, яны згледзелі трактар. З шумам і грукам поўз трактар у бок дарогі, як-бы намерваючыся перарэзаць яе. Трактарам кіравала Марына Кунашка. Адразу можна было пазнаць яе па чырвонай хустачцы, з пад якой выбіваліся непакорныя русыя кудры.

— З школы ідзеце, хлопчыкі?—весела запытала Марына, спрытна заварочваючы трактар, каб пачаць рэзаць новыя лусты пахучай зямлі.

Макарка і Лёнік прыпыніліся.

— Ці цяжка кіраваць трактарам, Марынка?

Як відаць пытанне гэтае дужа цікавіла Макарку.

— Як навучышся, дык яно і няцяжка,— адказала вясёлая трактарыстка. Трактар і Марынчына чырвоная хустачка паволі сталі аддаляцца ад дарогі, закрываючыся клубам лёгкага пылу.

Макарка і Лёнік пастаялі яшчэ трохі, покі адышоўся трактар і прыглух яго шум.

— Ну, займуся я трактарам,—рашуча выказаў Макарка,—зраблю мадэль, вывучу матор і ўсе часці і навучуся кіраваць трактарам, вось пабачыш!

— Давай зоймемся разам!—падхапіў Лёнік думку свайго прыяцеля.

— Давай!—згадзіўся Макарка.

Яны рушылі далей і з жарам вялі гутарку, як будуць рабіць мадэль трактара. Яны і не заўважылі, як амаль усутыч сышліся з незнаёмым чалавекам. Ён ішоў польнаю дарожкай і якраз выходзіў на вялікую дарогу, якою ішлі Макарка і Лёнька. Нічога асаблівага не было ні ў постаці гэтага чалавека, ні ў яго аблíччы, ні ў адзенні,—звычайны чалавек, сярэдняга росту, чарнявы. На від яму было не болей, як трыццаць гадоў. Гэта мог быць хто-небудзь з суседняга калгаса, брыгадзір, а можа аграном ці проста так сабе падарожны. Макарка зірнуў у твар незнаёмаму чалавеку. Трудна было адразу разабрацца ў тым уражанні, якое зрабіў на Макарку гэты чалавек і асабліва яго вочы, хоць яны таксама нічым асаблівым не вылучаліся з тысячы людскіх вачэй. І вось што ўразіла Макарку: яму здалося, што ён першы раз убачыў у чалавека вочы, а ў гэтых вачах было штосьці такое, што прымусіла Макарку злёгку здрыганушца і запыніць на абліччы не-

знаёмага чалавека свой погляд. Але ўсё гэта магло здарыцца ад нечаканасці і раптоўнасці спаткання. А можа ад таго, што вочы незнаёмага чалавека не так пазіралі на свет, як пазіраюць вочы людзей, якія сталі звыклымі для Макаркі. Макарку здалося, што і незнаёмы чалавек на момант адчуў нейкую няёмкасць, спаткаўшыся з ім і Лёнікам. Але калі гэтая няёмкасць і была ў незнаёмага чалавека, дык была яна толькі адзін момант.

— Куды гэта ідзеце вы, хлопчыкі?— запытаў незнаёмы чалавек. Запытаў ён прыязна і бестурботна. Так мог гаварыць чалавек, у якога на сэрцы поўны спакой і ніякіх ліхіх думак у галаве.

Макарка і Лёнік прыпыніліся.

— А мы сабе так ідзем—гуляем,—адказаў Макарка, а Лёнік дадаў у тон свайму сябру:

— Збіраем калекцыі.

— О, якія вы малайцы!—пахваліў іх незнаёмы чалавек і запытаўся ізноў:

— То мусіць вы—школьнікі?

Хлопцы адказалі не адразу.

— А навошта вам гэта ведаць?—запытаў і Макарка.

Незнаёмы чалавек дабрадушна засмяяўся.

— Малайцы! Слаўныя вы рэбяты! Не ўсё трэба гаварыць кожнаму, хто папытаецца ў вас, асабліва калі вы яго не ведаеце. Вось і я: а можа я—ліхі чалавек, шпіён які-небудзь?.. Вы-ж не ведаеце мяне.—І ён уважна паглядзеў на Макарку і Лёніка, прыветна кіўнуў ім галавою і, перасекшы вялікую дарогу, пайшоў далей польнаю дарожкай. Здзіўленыя спатканнем і гутаркаю з незнаёмым чалавекам, Макарка і Лёнік недаўменна і моўчкі зірнулі адзін аднаму ў вочы. Незнаёмы-ж чалавек, прайшоўшы крокаў дваццаць, аглянуўся і тонам нібы ўжо знаёмага з імі чалавека запытаў:

— А што—пападу я гэтай дарогай у Падбор'е?

— Пападзеце!—адказалі Макарка і Лёнік.



Незнаёмы чалавек павольна пайшоў далей.

Макарка раптам схапіў Лёніка за руку.

— Пойдзем сюды!—сказаў ён і пацягнуў яго ў бок з дарогі, за яе выступ, і спыніўся.

— Як ты думаеш, што гэта за чалавек?

У голасе Макаркі чулася нейкая трывога. Яна перадалася і Лёніку. Лёнік недаўменна ўскінуў плячыма і ціха сказаў:

— Ведаеш, Макарка, што: давай мы схаваемся так, каб нас не відаць было, а мы каб яго бачылі—куды ён пойдзе!

Прыгнуўшыся, яны борздзенька прайшлі выемкаю дарогі і ўзышлі на яе вал, дзе былі кусцікі, і прыляглі за імі. Макаркі і Лёніка не відаць было, дарожка-ж на Падбор'е і чалавек на гэтай дарожцы ім добра былі відны. Яны пільна сачылі за незнаёмым чалавекам, ахопленыя пачуццём нейкага непакою. Польная дарога і незнаёмы чалавек на ёй блізіліся да зарасніку, дзе дарога забірала ўлева,

прайшоўшы некалькі сажняў зараснікам, а потым зноў выходзіла з яго, пакідаючы зараснік убаку. Лёніку здалося, што на паваротцы незнаёмы чалавек зірнуў у бок зарасніка і нібы прыцішыў тэмп сваёй хады, як-бы мяркуючы, куды яму падацца.

— Калі зверне ў кусты, дык гэта — адтуль, — ціханька сказаў Лёнік і кіўнуў на граніцу. Макарка маўчаў, баючыся хоць на момант спусціць з вачэй незнаёмага чалавека. У меру таго, як чалавек гэты падыходзіў да хмызняка, узрастала хваляванне Макаркі і Лёніка. Вось ён параўняўся з зараснікам. Яго постаць нібы на момант спынілася, а потым зраптам знікла. Засталася адна дарога і зялёны астравок зарасніка. Але чалавек павінен зараз паказацца ізноў: край зарасніка, праз які праходзіць дарога, невялікі — мінута хады, не болей. Ды чалавек не паказваўся. Адзінокая і пустая дарога, мінуўшы хмыз, узбіралася на ўзгорак і была добра прыметна, але чалавека на

ёй не было. Макарка і Лёнік, затаіўшы дух, пазіралі на дарогу ўскрай хмызу. Прайшло некалькі хвілін, напружаных і хвалюючых. Анямелая дарога глуха маўчала, зліваючыся з зямлёю сваімі цмянымі каляінамі і ўсім сваім ледзь прыметным абрысам.

— Пашыўся ў кусты, — прашаптаў устрывожаны Макарка.

— А пытаў дарогу на Падбор'е!—таксама ціха азваўся Лёнік.

Яшчэ некалькі хвілін пазіралі яны на дарогу—чалавека не было.

— Лёнік, гэта—шпіён!—сказаў Макарка, і ўпэўненасць чулася ў яго голасе.

— Шпіён!—пацвердзіў Лёнік, а твар яго стаў заклапочаным.

— Што-ж нам рабіць?—запытаў ён.— Схаваецца гад, уцячэ!

У Макаркавай галаве раптам узнікла мысль.

— Вось што, Лёнік: сядзі тут, караўуль, а я—на заставу!

— Бяжы, бяжы—напрасткі! А я буду глядзець... А то можа я пабягу?

— Не, Лёнік, ты аставайся тут і глядзі, ці не пакажацца ён і куды ён пойдзе.


III

Лёнік астаўся адзін на сваёй варце. Ён не спускаў з вачэй таго месца, дзе знік незнаёмы чалавек, глядзеў на дарогу за хмызняком і на ўсе выхады з хмызняка. Ён толькі зрэдку пераводзіў вочы ў той бок, куды пабег Макарка. А Макарка спяшаўся хутчэй дабегчы да заставы. Ён выбіраў такія мясціны, каб не кідацца нікому ў вочы, асабліва каб не згледзіў яго той страшны і ліхі чалавек і каб не разгадаў яго намер. Некалькі разоў мільгнула яго шапка ў Лёнькіных вачах, а потым Макарка зусім схаваўся за ўзгоркамі, што ішлі ў бок заставы.

Лёніку спачатку было трохі страшна. А што калі гэты ліхі чалавек дагадаецца і паверне назад? А можа ён пяройме дзе-небудзь Макарку?.. А можа гэта і не

ліхі чалавек, і яны дарэмна падымаюць трывогу, а на заставе толькі пасмяюцца з іх. Але Лёнік пільна стаяў на варце і зорка пазіраў, каб не прапусціць таго чалавека. Часамі ён уставаў, потым зноў садзіўся, а затым прахаджваўся направа і налева ад сваёй засады, не адыходзячы далёка ад яе. Час цягнуўся вельмі марудна. Лёніку было неяк і маркотна аднаму. Зрэдку далятаў сюды шум ад трактара, калі трактарыстка Марына пад'язджала бліжэй да дарогі. Тады Лёніку было шмат весялей, і думкі пра Макарку былі весялейшыя.

Ужо калі большая часць дарогі асталася ззаду і перад вачыма Макаркі паказалася застава, тады толькі ён перавёў дух і ўздыхнуў вальней. Ад бегу і шпаркай хады шчокі яго разгарэліся, як мак, і сэрца стукала моцна і часта. Цяпер ён ішоў крыху спакайней і думаў пра тую гутарку, якая павінна адбыцца ў яго на заставе аб тым няпэўным чалавеку, якога трэба было праверыць. Ён быў



пераконан, што паступае правільна, і гэта прыдавала яму смеласці. Каля варот заставы стаяў з вінтоўкаю пагранічнік-чырвонаармеец. Ён здалёк згледзіў Макарку і павярнуўся ў яго бок. Усё Макаркава аблічча казала за тое, што ён ідзе з нейкімі навінамі. Кроках у двух ад вартавога Макарка спыніўся. Чырвонаармеец пазіраў на Макарку, а Макарка глянуў у вочы чырвонаармейцу! У чырвонаармейца былі вясёлыя шэрыя вочы. У іх Макарка адразу адчуў нейкую прыязнь, успомніўшы пры гэтым той дзіўны погляд і вочы незнаёмага чалавека, якія так уразілі Макарку. З гэтага часу ў яго так і асталася манера прыглядацца да вачэй таго, з кім яму прыходзілася так ці іначай мець дачыненне. Усё гэта адбылося ў адзін момант.

— Што скажаш, дружок?—запытаў чырвонаармеец.

— Мне на заставу... да начальніка.

— Што хочаш сказаць яму?

— Мы бачылі нейкага чалавека... відаць, ён перайшоў граніцу.

Чырвонаармеец болей не распытваў Макарку і толькі сказаў:

— Пастой трохі тут,—і хутка падаўся да варот у невялікую прыбудоўку. Праз колькі хвілін чырвонаармеец вярнуўся, а яшчэ праз хвіліну ў дзвярах прыбудоўкі паказаўся высокі і статны лейтэнант. Ён быстра акінуў вачыма Макарку.

— Ну, расказвай, брат, што там такое,—звярнуўся ён да Макаркі. Макарка тарапліва, часамі глытаючы словы, расказваў пра спатканне з незнаёмым чалавекам і пра тую гутарку, якая паказалася і Макарку і Лёніку падазронаю. Таксама адзначыў ён погляд незнаёмага чалавека і «нейкія не такія, як у людзей вочы». А самае важнае ў паводзінах незнаёмага чалавека было тое, што ён распытваў пра Падбор'е, месца, дзе знаходзіцца застава, тым-жа часам ён звярнуў з дарогі ў Падбор'е і знік у зарасніку. Камандзір слухаў уважліва. Потым

паставіў цэлы рад кароткіх пытанняў, як выглядае незнаёмы чалавек, малады ён ці стары, нізкі ці высокі і як ён адзеты. Макарка даваў дакладныя адказы.

— Добра!—сказаў начальнік,—пастой тут!

Лейтэнант быстра павярнуўся, аддаў нейкі загад. Зараз-жа з двара заставы пачулася тухканне конскіх капытаў. Да варот пад'язджалі два конных чырвонаармейцы з асядланым канём для камандзіра. Адзін чырвонаармеец сядзеў у сядле з сабакам, падобным да ваўка. Вартавы расчыніў вароты.

— Ну, давай!—сказаў камандзір і спрытна ўскочыў на каня.

— Давай сюды, браток!—камандзір падаў Макарку руку.

Вартавы чырвонаармеец лёгка падхапіў Макарку, і Макарка не апомніўся як ён апынуўся ў сядле разам з камандзірам.

— Трымайся за мой кушак і паказвай дарогу.



Макарка горда сядзеў у сядле ўперадзе камандзіра.

Лёнік пачынаў ужо непакоіцца, ці не здарылася чаго з Макаркам. Як ні глядзеў ён на зараснік, нікога там не было. Цяпер ён часта пераводзіў вочы ў той бок, адкуль павінен быў паказацца Макарка. І раптам зусім з другога боку і зусім нечакана згледзеў ён трох пагранічнікаў вярхом на конях. Паказаліся яны раптоўна, нібы выраслі з зямлі. Радаснае здзіўленне Лёніка яшчэ болей узрасло, калі ён убачыў Макарку на адным сядле з перадавым коннікам. На тым месцы, дзе з імі сустрэўся незнаёмы чалавек, усе тры коннікі спыніліся і пазлазілі з коней. Лёнік ужо быў памкнуўся бегчы да іх, ды спыніўся спалоханы: да яго бег Гун. Але Гун лагодна абнюхаў Лёніка і глянуў яму ў вочы, нібы хацеў сказаць: «Ведаю, ты — прыяцель Макаркаў». А Макарка гукнуў:

— Не бойся, Лёнік, ён не ўкусіць. Бяжы сюды!



Лёнік падбег да пагранічнікаў і папіонерску прывітаўся.

— Ну, што бачыў на сваёй варце?— запытаў лейтэнант.

— Глядзеў я ўвесь час, але ён болей не паказваўся. Знік.

— А дзе іменна тое месца, дзе вы з ім гаварылі?—запытаў лейтэнант Макарку і Лёніка.

Яны дакладна паказалі. Чырвонаармеец узяў сабаку на павадок і паказаў след прайшоўшага з гадзіну таму чалавека. Гун абнюхаў след і раптам змяніўся ў сваіх паводзінах: прыўзняў вушы, падняў галаву, панюхаў паветра навокал і падаўся ў бок зарасніка, цягнучы за сабою чырвонаармейца. Лейтэнант загадаў аднаму пагранічніку ехаць конна побач пагранічча і ў пэўным месцы ўзяць улева і ехаць на такое то месца. Пагранічнік паўтарыў загад і са словамі «ёсць, таварыш камандзір» паскакаў па ўказаным кірунку. Лейтэнант і другі пагранічнік рушылі дарожкай у бок зарасніка.

Макарка і Лёнік ішлі за імі: яны папрасілі дазволу дайсці з пагранічнікамі хоць да таго месца дзе знік незнаёмы чалавек. Да зарасніка было не болей, як поўкілометра. Макарка і Лёнік падыходзілі да яго ў вялікім хваляванні: у гэтым зарасніку, на іх думку, павінна разгадацца загадка аб незнаёмым чалавеку. Сабака ўвесь час ішоў па слядах. Вось і зараснік. Сабака з дарогі не зварочваў і толькі ў тым месцы, дзе дарога пакідала зараснік і падымалася на горку, Гун павярнуў направа і вёў ускрайкам зарасніка, а потым звярнуў у зараснік. Чым далей, тым гусцей станавіўся зараснік, спускаючыся ў лагчыну і пераходзячы ў буйны хмыз, дзе пачалі пападацца разложыстыя ёлкі, а ніжэй пайшоў алешнік, прымыкаючы з аднаго боку да балотнай лугавіны, а далей пераходзячы ў стары пануры лес. Прабірацца з коньмі тут было трудна.

Лейтэнант спыніўся і сказаў:

— Коней пакінуць тут.

— Мы пабудзем каля іх!—азваўся з кустоў Макарка. Яны зводдаль ішлі за пагранічнікамі. Ім так хацелася быць з імі і хоць чым-небудзь дапамагчы.

— А, вы ўсё тут!—сказаў лейтэнант.— Далей ні на крок! Вярніцеся назад, а калі хочаце, дык чакайце нас там у зарасніку каля дарогі.

Макарка і Лёнік спыніліся каля дарожкі ў зарасніку і чакалі. Зрэдку то адзін, то другі адыходзіліся трохі воддаль, дзе было зусім ціха і нішто не замінала ім слухаць. Навокал стаяла маўклівая цішыня. Здавалася і вецер, і гэты зараснік, і поле, і лес прытаілі дыханне і таксама слухалі. Але голас у гэтай цішыні не меў сілы: ён зараз-жа расплываўся на блізкай адлегласці і прападаў. Чуваць было толькі, як празвініць нейкім сумотным звонам пчала ці мушка, пралятаючы сваёю дарогай. Макарка і Лёнік, варочаючыся з подслухаў, некалькі хвілін гутарылі, выказвалі свае меркаванні і розныя прыпушчэнні. Потым ізноў адыходзіліся

трохі далей і слухалі. Лёніку нават здалося раз, нібы дзесь у лесе пачуўся стрэл. Ён доўга ўслухваўся ў цішыню, але з лесу не даносілася болей ніякіх галасоў. Ён толькі чуў шум у сваіх вушах і розныя зманлівыя гукі. А зараснік і той густы лес, куды падаліся пагранічнікі, упарта хавалі сваю вострую загадку аб незнаёмым чалавеку.

Макарка раптам увесь аж падскочыў.

— Глядзі, Лёнік, унь, бачыш, нейкія людзі! Макарка паказаў рукою на густы лес. І сапраўды, з правага крыла лесу, што абступаў поле іх калгаса, вырысаваліся на момант малюсенькія чалавечыя фігуркі, але зараз-жа зніклі. Некалькі хвілін хлопцы стаялі моўчкі і прагна ўзіраліся ў тое месца, дзе паказаліся людзі. Лёнік бачыў іх толькі на адзін міг.

— Колькі іх было?—запытаў ён.

— Ці то два ці тры,—адказаў Макарка.

Хваляванне іх узрастала, але постаці

людзей не паказваліся. Аж непадалёку адтуль праімчаўся чалавек на кані.

— Гэта яны, нашы!—крыкнуў Лёнік.

Яны добра бачылі верхавога, але і ён схаваўся. Напэўна гэта той пагранічнік, якога камандзір паслаў уздоўж граніцы, каб на ўсякі выпадак перагарадзіць дарогу шпіёну. Праз некалькі хвілін на грэбені ўзгорка ў некаторай адлегласці ад лесу паказаліся тры чалавекі. Цяпер яны выдаваліся шмат большымі. Яшчэ праз момант выплыла і постаць чалавека на кані. Ён далучыўся да групы з трох чалавек і ехаў ступою крыху збоку ад іх. Так, гэта яны, пагранічнікі. Але Лёнік пасеяў вялікае сумненне.

— Макарка!—сказаў ён,—гэта, мусіць, другія пагранічнікі.

— Чаму ты так думаеш?—запытаў Макарка.

— А чаму сабакі не відаць?

Макарка сумеўся. І праўда—сабакі не было.

Уся група, трое пешых і адзін конны,



паволі набліжаліся. Макарка і Лёнік чакалі з заміраннем сэрца. Цяпер усё было відаць добра: конны пагранічнік, чырвонаармеец у руках з вінтоўкаю напагатове, а перад ім у двух кроках, унурыўшыся, ішоў той самы незнаёмы чалавек! Лейтэнант замыкаў групу. Макарка і Лёнік хутка накіраваліся да пагранічнікаў. Камандзір даў пагранічнікам нейкі загад, а сам пайшоў насустрач хлопцам.

— Ну, рэбяткі,—спытаўся ён,—той гэта ці не?

— Той, той!—разам пацвердзілі Макарка і Лёнік.

— Дзякую вам, рэбяткі, гуся злавілі мы важнецкага!

— Дзядзя!—звярнуўся да яго Лёнік,—а дзе-ж сабака?

Лейтэнант крыху нахмурыўся.

— Загінуў бедачына,—з ноткай жалю сказаў ён.—Застрэліў яго негадзяй гэты. Думаў выратаваць сваю прадажную скуру, ды не прышлося.—Лейтэнант запытаў прозвішча Макаркі і Лёніка, дзе

яны жывуць і дзе вучацца, і ўсё гэта запісаў у кніжачку, яшчэ раз падзякаваў іх, як гарачых патрыётаў сваёй зямлі, і развітаўся з імі.

* *
*

Праз дзён дзесяць урачысты сход адбываўся ў школе. На відным месцы за сталом прэзідыума сядзелі Макарка Навак і Лёнік Атрушкевіч. На трыбуне—начальнік пагранічнай заставы. У простых і жывых словах гаварыў ён сходу аб нашым светлым жыцці, здабытым упартаю працаю і сумеснаю барацьбою ўсіх народаў вялікай совецкай зямлі пад сцягам гераічнай партыі Леніна—Сталіна. Ён расказаў, з якою нянавісцю глядзяць паны на нашу краіну: росквіт совецкай зямлі і добрабыт яе народаў—смяртэльная небяспека для паноў, асуджаных на пагібель. Іх агентура пускаецца на ўсё, каб шкодзіць нам і падрываць нашу моц. Але дарэмны іхнія патугі. З'яднаны, магутны совецкі народ—вялікі патрыёт

сваёй зямлі і не дапусціць панскую поскудзь паганіць яе.

Цэлы рад прыкладаў прывёў прамоўца, як пільна і свята ахоўвае свае рубяжы совецкі народ і дапамагае пагранічнікам знішчаць шпіёнаў.

— Я рад,—сказаў прамоўца,—папоўніць гэтыя прыклады яшчэ адным новым прыкладам.

Начальнік заставы паказаў на Макарку і Лёніка. Многалюдны сход горача і доўга вітаў піонераў-герояў воплескамі. Прамоўца расказаў сходу гісторыю, як быў злоўлены незнаёмы чалавек. Ён аказаўся вельмі буйным шпіёнам.

Ад імя пагранічнікаў Макарку і Лёніку была выказана падзяка і прыпаднесены цэнныя падарункі.

Макарка і Лёнік адчувалі сябе шчаслівымі і гордымі, бо яны чэсна выпаўнілі перад радзімаю свой грамадскі абавязак.

1938 г.

Рэдактар *Т. Гарбуноў*
Тэхрэдактар *І. Мілешка*
Карэктар *Н. Смольская*

Здана ў друкарню 1|IX—1939 г. Падпісана да друку 31|X—1939 г. Аб'ём 1¼ друк. арк. Папера 70×108 $^{1}/_{32}$. Знакаў у друк. арк. 29.952.
Тыраж 7.000 экз. Заказ № 930.
Уп. Галоўліта БССР № М—21123.

Друкарня імя Сталіна. Мінск, Дом Друку.

Цана 50 кап.



НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

Я. КОЛОС

У ЗАСТАВЫ

Государственное
Издательство
Белоруссии

Минск